**Упраўленне па адукацыі, спорту і турызму**

**Капыльскага райвыканкама**

**ДУА “Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс**

**дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі”**

Сцэнар выхаваўчага мерапрыемства

# «Ад бітваў крывавых, ад слаўных паходаў мае землякі не былі ў старане»

Падрыхтавала

настаўнік беларускай мовы

і літаратуры I катэгорыі

Майсюк А. У.

Аг. Пясочнае 2020

**Мэта:** паглыбленне і асэнсаванне ведаў навучэнцаў аб падзеях гісторыі Беларусі і аграгарадка Пясочнае ў 1941 – 1945 гг.

**Задачы**:

выхаванне ў навучэнцаў патрыятызму і грамадзянскасці на мужных прыкладах з жыцця сваіх землякоў;
выхаванне асабістых якасцей абаронца Айчыны;
фарміраванне антываеннай пазіцыі.

**Месца правядзення –** краязнаўчы музей ДУА «Песачанскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-базавая школа імя С. А. Умрэйкі»

**Формы правядзення:** літаратурна-музычная кампазіцыя, экскурсія, абмен думкамі.

**Музейныя экспазіцыі:** «Нашы героі», «Бязлітасная вайна», «Знаходкі з месцаў былых баёў», «Лісты з фронту», «Сцяпан Андрэевіч Умрэйка-вучоны, педагог, грамадзянін», «Паэт-песеннік Адам Русак », «Паэт-песеннік Анатоль Астрэйка».

**Абсталяванне**: аўдыёзапісы, ноўтбук; фотаздымкі ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны С. А. Умрэйкі; чамадан з прадметамі: старыя газеты, медаль "За адвагу", дзіцячыя валёначкі, бінт, лустачка хлеба, прабітая салдацкая каска.

**Эпіграф-плакат**:

За ўсё-ж даражэй мне адданасць народа.
Ніхто нас за справы нічым не ўпікне.
Ад бітваў крывавых, ад слаўных паходаў
Мае землякі не былі ў старане.

А. Астрэйка

*Удзельнікі садзяцца ў музейным пакоі.*

*Гучыць мелодыя беларускай народнай песні "Купалінка".*

*На ўмоўнай сцэне – шчаслівая дзяўчынка з кветкамі і яе маці.*

- Мамачка, пчолкі лятуць,
  Можна я палаўлю іх, мама?
- Не, не, дочачка, гэта – кулі…
  Гэта, дзеткі вайна…

*Чуюцца акорды песні "Свяшчэнная вайна" (сл. В. Лебедзева-Кумача, муз. А. Аляксандрава)*

**1-ы вядучы**. Пачалася вайна, і жыццё адразу ж змяніла свой сэнс, свае напаўненне.

**2-і вядучы.** Людзі кажуць, што ў Пясочным яшчэ да вайны жыла на “Воўчым хвасце” непісьменная жанчына, якая прадказала набліжэнне страшнага ваеннага часу. Аднойчы, лежачы на печы, яна прамовіла сыну: “Хутка будуць лётаць жалезныя птушкі, кідаць цацкі жалезныя, ад гэтых цацак будзе смерць людзям, будзе гарэць усё. Пасля прыдуць людзі ў жалезных шапках, будуць надта здзекававацца, будуць людзей паліць, страляць.” У хату зайшла суседка, і сын сказаў ёй: “Паслухайце, што мая маці гаворыць!”. Суседка паслухала і зразумела, што гэта жахлівае прадказанне – прадказанне вайны.

**1-ы вядучы**. І словы яе спраўдзіліся. Немцы напалі на нашу зямлю без папярэджання. У першыя дні вайны капыльская зямля ўпітала ў сябе першую кроў сваіх абаронцаў. Чырвоная Армія вяла цяжкія баі  і на тэрыторыі Капыльскага раёна.  І гэта быў толькі пачатак. За доўгія тры гады нямецкай акупацыі наша Радзіма прыме ў сябе рэкі крыві  тысяч загінуўшых у баях чырвонаармейцаў, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў: расстраляных, павешаных, спаленых і зверскі замучаных.

**2-і вядучы.**

На беларускай зямлірazгарнулася сапраўдная усенародная партызанская барацьба.  Беларусь увайшла ў гісторыю Вялікай Айчыннай вайны як мужная краіна-партызанка.

<u>1-ы чытальнік.</u>

Калі над радзімай пажары шугалі
І неба гуло ад грымот, —
Пад шумнымі соснамі мы прысягалі
Табе, беларускі народ!
За край свой забраны
Ішлі ў партызаны,
Збіраліся дружна на бой!

<u>2-і чытальнік.</u>

А гора народа кружыла над намі,
І ў кожнага рана свая.
Палямі, гаямі, ляснымі шляхамі
Праходзіла наша сям'я.
За здзекі, за раны
Сыны-партызаны
Выходзілі ворага біць.

<u>3-і чытальнік</u>

І ў цёмныя ночы, і ў раннія росы
Ад нашых адважных засад
Лятуць пад адкос мерцвякі-паравозы
І трупы фашысцкіх салдат.
Масты узлятаюць,
Машыны знікаюць
Пад смелым агнём партызан.
У нашых паходах сцягі баявыя,
І помста — адзіны наказ.
Мы бачым, як маці, ад гора сівыя,
Выходзяць насустрач да нас.

1-ы чытальнік

Не плачце, матулі,
Мы ўсіх вас атулім
Надзейнаю ласкай сваёй.
Хай многа наперадзе смутку і болю
Не раз нам яшчэ сустракаць,
Біць ворагаў лютых,
Клянёмся,
Ніколі
Не стоміцца наша рука,
Пакуль не заграе
Вясна залатая
Над роднаю нашай зямлёй.

Вядучы запрашае ўдзельнікаў падысці і разгледзець экспазіцыі «Нашы героі», «Лісты з фронту», «Знаходкі з месцаў былых баёў» *(свабоднае перамяшчэнне ўдзельнікаў, пытанні да экскурсаводаў)*

**Экспазіцыя «Паэт-песеннік Анатоль Астрэйка»**

**Экскурсавод**. Вайна перакрэсліла ўсе планы паэта Анатоля Астрэйкі. Па заданні камандавання ён прабіраецца да партызан. Працуе адказным сакратаром сатырычнай газеты-плаката "Раздавім фашысцкую гадзіну". Анатоль Вялюгін назваў вершы Анатоля Астрэйкі "лірычным толам", якія "крышаць у немцаў рэйкі".
*/Навучэнцы разглядаюць экспазіцыю, прысвечаную Анатолю Астрэйку і копіі газеты-плаката "Раздавім фашысцкую гадзіну!"/*

У 1943 годзе слуцкія падпольшчыкі ў падпольнай друкарні выпусцілі кнігу вершаў Астрэйкі "Слуцкі пояс". Яна стала блізкай і неабходнай для змагароў з акупантамі. Самым вядомым творам быў верш "Беларусь-партызанка".

1-ы чытальнік.

**Беларусь-партызанка**

Мы асфальтам балоты завём
І шасейнай дарогі сцяжынку.
Два гады мы і косім, і жнём,
Каб вялікія справіць дажынкі.
Аўтаматы нам служаць касой,
А сярпамі - гранаты, наганы.
Не расою - варожай крывёй
Акрапляюць зямлю партызаны.
Там, дзе нас не чакаюць - мы там,
А дзе ладзяць засаду - абыдзем.
Тут усё паслухмянае нам,
Нават месяц, то ўстане, то зайдзе.
Спее волі і ўчасця прыход,
Што расце на франтах і палянах.
Не зламаць, не сагнуць мой народ,
Бо ўся Беларусь - партызанка.

**Экспазіцыя «Сцяпан Андрэевіч Умрэйка – вучоны, педагог, грамадзянін».**

**Экскурсавод.** З 23 чэрвеня 1941 года Сцяпан Андрэевіч Умрэйка - удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Змагаўся на Западным фронце, быў намеснікам камандзіра па палітчасці. Некалькі разоў быў паранены.

**Метад "Мова фотаздымкаў"**

*Перад навучэнцамі раскладваюцца фотаздымкі С. А. Умрэйкі часоў Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага часу. Кожны выбірае сабе адзін і коратка каментуе свой выбар, выказвае ўслых, якія думкі, пачуцці ўзніклі ў яго ў сувязі з фотаздымкам.*

**Экспазіцыя «Бязлітасная вайна».**

**Экскурсавод 1**. Найбольш цяжкія, жахлівыя старонкі біяграфіі Пясочнага прыпадаюць на гады Вялікай Айчыннай вайны. Ужо ў 1942 годзе ўсе мужчыны, хто мог насіць зброю, ваявалі ў партызанскіх атрадах і на фронце. Насельніцтва дапамагала партызанам ежай, адзеннем, абуткам. Пясочнае тады называлі партызанскай Масквой. Наш зямляк Анатоль Астрэйка ў 1945 годзе з гонарам напісаў:

За ўсё-ж даражэй мне адданасць народа.
Ніхто нас за справы нічым не ўпікне.

Ад бітваў крывавых, ад слаўных паходаў
Мае землякі не былі ў старане.

Летам 1943 г. па сутнасці ўвесь раён кантраляваўся партызанамі. Ім дапамагала мясцовае насельніцтва. На тэрыторыі Капыльшчыны на гэты час у асноўным дзейнічала брыгада імя Чапаева. Праўда, рабілі налёты на варожыя гарнізоны, арганізоўвалі засады на дарогах байцы і з іншых партызанскіх брыгад, якія размяшчаліся паблізу.




**Экскурсавод 2.** Фашысты не раз ўчынялі крывавыя расправы над мірнымі жыхарамі: здзекваліся з яўрэяў (у Пясочным было гета), цікавалі за партызанскімі сем'ямі і распраўляліся з імі.

5 студзеня 1943 г. ў Пясочнае прыехаў карны атрад. Фашысты спачатку атачылі ўсю вёску, затым пачалі зганяць на школьны двор людзей, члены сям'яў якіх былі ў партызанах або якія мелі сувязь з партызанамі. Старая школа размяшчалася тады на месцы, дзе цяпер пабудаваны Дом культуры. У школе паставілі кулямёт. Людзей кідалі ў адзін з класаў і там расстрэльвалі. Пасля ад'езду карнікаў жыхары Пясочнага кінуліся да месца растрэлу. Здавалася, што ўся вёска патанула ў крыку, стогне і плачы. У той дзень было расстраляна 43 чалавекі – 30 дарослых і 13 дзяцей.

**Экскурсавод 1.** 20 верасня 1943 года і 11 мая 1944 года Пясочнае падверглася нямецкім бамбардзіроўкам. Немцы баяліся ісці ў партызанскую зону, таму і стараліся паліць і забіваць з паветра. Пасля бамбардзіровак гарэлі многія дамы. Вясной 1944 года песачанцы заставаліся ў вёсцы толькі ў пахмурныя дні. У ясныя дні амаль усе ішлі ў бліжэйшыя лясы, дзе былі пабудаваны схованшчы.

**Метад "Абмен думкамі"**

*У музейным пакоі знаходзіцца чамадан з наступнымі прадметамі: старыя газеты, медаль "За адвагу", дзіцячыя валёначкі, бінт, лустачка хлеба, прабітая салдацкая каска. Навучэнцы сядзяць па крузе. Ім прапануецца,*

*гледзячы на  прадмет, апісаць магчымую жыццёвую сітуацыю, звязаную з ім. Важна выказваць думкі, якія ўзнікаюць спантанна.*

**Экспазіцыя «Паэт-песеннік Адам Русак ».**

*Удзельнікам раздаюцца словы "Лясной песні"*

**Экскурсавод**. "Лясная песня". Словы яе напісаў наш зямляк Адам Русак, а Уладзімір Алоўнікаў паклаў іх на музыку. Гэты неафіцыйны партызанскі гімн узнік пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Аднак былыя партызаны сцвярджалі, быццам спявалі яго пасля баёў. Песня настолькі ўвайшла ў наша жыццё, што многія адносяць яе да ліку народных. Дарэчы, бярозы і сосны ў першым радку песні — гэта лес вакол Пясочнага.

***Пад акампанемент гітары навучэнцы выконваюць "Лясную песню" (словы А. Русака, музыка У. Алоўнікава)***

**Лясная песня**

Ой, бярозы ды сосны –
Партызанскія сёстры,
Ой, шумлівы ты лес малады.
Толькі сэрцам пачую
Тваю песню лясную
Ды ўспомню былыя гады.
Ды ўспомню пажары,
І варожыя хмары,
І завеі халодных снягоў,
І слату, і нягоды,
І начныя паходы,
І агні партызанскіх кастроў.
Край любімы мой, родны,
Ты на свеце свабодны,
За цябе я на бітву хадзіў,
Каб ніколі, ніколі
Ты не быў у няволі,
Каб чырвонымі кветкамі цвіў.
Адышлі тыя годы,
Адгрымелі паходы,
Толькі пушча за полем шуміць.
Ой, бярозы ды сосны –
Партызанскія сёстры,
Вас ніколі ў жыцці не забыць.

1950

**1-ы вядучы.** Насупраць нашай школы, ў парку – **брацкія могілкі (фота)**. Тут пахаваны 12 партызанаў 300-й брыгады імя Варашылава, 27-й брыгады імя Чапаева і адзін чырвонаармеец, якія загінулі ў 1942-1944 гадах.



У 1956 годзе тут устаноўлены помнік “Смуткуючая маці”. На мемарыяных плітах выбіты імёны182-х чалавек, загінуўшых на фронце і на акупіраванай тэрыторыі.

**Чытальнік.**

**Адам Русак . Пясоцкім партызанам**

Іх на плошчы сяла пахавалі
Каля хат і шумлівых садоў,
На магілы ім кветкі саджалі,
Што прыносілі з родных палёў.

На заданне ішлі яны смела
І жыццё за свой край аддалі,
Каб заўсёды зямля маладзела
І людзі ў шчасці жылі.

Сціхлі сэрцы ў іх маладыя,
Ім хацелася жыць і любіць,

Бачыць сонца, жыты залатыя,

Чуць, як ніва на ветры шуміць.

Іх на плошчы сяла пахавалі,

На магілах вяргіні цвітуць,

І калышацца Нёмана хвалі,

Пра іх славу ў далі нясуць.

1965 г.

***Гучыць мелодыя песні на словы А. Вярцінскага “Два полі” (музыка Э. Ханка)***



**1-ы вядучы.** Штогод 9 мая на брацкіх могілках праходзіць мітынг, прысвечаны Дню Перамогі. У гэтым годзе мы будзем святкаваць 75-годдзе Вялікай Перамогі. Знамянальная дата дорага для сэрца кожнага з нас.

**2-і вядучы.** Давайце успомнім імёны герояў, аддаўшых жыццё ў суровых бітвах, успомнім мірных жыхароў, расстраляных, замучаных, загінуўшых у полымі вайны, успомнім ветэранаў, якіх ужо няма з намі. Светлая ім памяць!

**Аб’яўляецца хвіліна маўчання.**

**Ускладанне вянка на месцы воінскага пахавання.**